Галкоўская Г.Л.,
выкладчык

## ПРАБЛЕМЫ НАВАТАРСТВА Ў РЭЖЫСУРЫ ТЭАТРАЎ-СТУДЫЙ У БЕЛАРУСІ КАНЦА 80-х – пач.90-х ГАДОЎ

З'яўленне студыі – заўсёды адлюстраванне альбо тэатральнага росту, альбо тэатральнага крызісу.

Калі азірнуцца назад, то ўбачым, што стварэнне першых у краіне тэатраў-студый звязана хутчэй з рэакцыяй на адсутнасць змен у грамадстве і тэатральнай сітуацыі.

Студыя сведчыць аб сувязі рэчаіснасці і наступленні новага часу. Цяперашні студыйны рух існуе больш чым 10 год. Дзякуючы яму ў беларускі тэатры сцвердзілася ідэя шматварыянтнага тэатра і існавання розных тэатральных напрамкаў.

Сучаснае студыйнае мастацтва – рызыковыя эксперыменты ў галіне парадаксальнага тэатра і пошукі знешніх сродкаў выразнасці, тэхнічных эфектаў. Гэта робіць асаблівы ўплыў на фарміраванне творчай асобы студэнта і ставіць задачу перад выкладчыкамі ў плане фарміравання эстэтычнага ідэалу.

Назіраюцца агульныя тэндэнцыі творчых пошукаў у рэжысуры студыйнага руху. Сучасныя студыі можна падзяліць на два тыпы. Адны з іх у першую чаргу шукаюць сродкі знешняй выразнасці, адсюль і імкненне да больш яркай і вынаходлівай формы, выразнай сцэнаграфіі. Стыль другіх – вельмі просты, часам зусім не мае "тэатральнай атрыбутыкі". Іх мэта - пошукі чыстага чалавечага кантакту з гледачом. Адсюль асобная канцэнтрацыя на ўнутранай тэхніцы акцёра. Студый другога тыпу менш, чым першага.

Значна ўзраслі патрабаванні да сцэнічнага мастацтва, і рэчаіснасць патрабуе ад выкладчыкаў спецдысцыплін больш складанай і дасканалай методыкі навучання рэжысёрскаму мастацтву.

Сучасны выкладчык павінен улічваць тэндэнцыі сённяшняга творчага працэсу і імкнуцца сінтэзаваць класічную і сучасную школу.

Паўстае чарга найбольш значных праблем развіцця студыйнага мастацтва. Па-першае, вызначаецца тэндэнцыя да растварэння аўтарскай тэмы ў канцэпцыі рэжысёрскай задумы, што прыводзіць да сціранне асаблівасцей драматургіі.

Па-другое, існуе перагрузка рэжысёрскімі знакамі і сімваламі, шматлікімі прыстасаваннямі.

Па-трэцяе, вызначаецца аднастайнасць у вырашэнні сцэнічных вобразаў, што зніжае узровень эмацыянальнага ўспрымання ў гледача.

Па-чацвёртае, частае ўжыванне гратэску як асноўнага мастацкага прыёму прыводзіць да аднастайнасці тэатральнага выяўлення.

У сувязі з гэтым у методыцы выкладання трэба ўлічваць праблемы сучаснага творчага пошуку і надаць асобую ўвагу авалоданню студэнтамі элементамі школы, большаму ўдасканаленню ўнутранай тэхнікі акцёра.

Лапчыніна З.Ф.,
ст.выкладчык

## УДАСКАНАЛЕННЕ СІСТЭМЫ НАВУЧАННЯ СТУДЭНТАЎ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ "РЭЖЫСЁР АМАТАРСКАГА ТЭАТРА" НА АСНОВЕ МІЖПРАДМЕТНЫХ СУВЯЗЕЙ

Мэта выкладчыка Беларускага універсітэта культуры - навучыць кожнага студэнта адказна і патрабавальна ставіцца да сваёй справы, улічваць сучасныя патрабаванні ў галіне культуры. Гэтаму павінны садзейнічаць такія дысцыпліны, як "Рэжысура і майстэрства акцёра", "Сцэнічная мова", "Культура мовы", "Сцэнічны рух", "Музыка ў спектаклі", "Грым" і інш.

Мы павядзем гаворку пра "Сцэнічную мову" і "Культуру мовы".

Добры? Злы? Упарты? Духоўна багаты ці бедны? Усё гэта мы вызначаем па мове. "Загавары хутчэй, каб я цябе ўбачыў!" - сказаў некалі Сакрат, калі да яго прывялі вучня для выяўлення яго здольнасцей. Нават самая паўсядзённая гаворка - складаны моўны акт.

Выкладчыкамі тэатральных навучальных устаноў распрацавана сістэма разнастайных практыкаванняў, якія дапамагаюць адчуваць, дзейнічаць, думаць у прапанаваных абставінах.

"Перш чым выступіць перад публікай, акцёр павінен прайсці цэлую школу тэатральнага мастацтва. Ён павінен навучыцца валодаць мімікай, жэстамі, а асабліва ж голасам, каб кожнае слова яго даходзіла да слыху гледача

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ